PolotskSU



УДК 94(476):«1911»

# СІСТЭМА ПАЧАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ ПАВОДЛЕ ВЫНІКАЎ ПЕРАПІСУ 18 СТУДЗЕНЯ 1911 Г.

**Мяньчэня С.В.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*Матэрыялы аднадзённага перапісу пачатковых школ 18 студзеня 1911 г. з’яўляюцца каштоўнай крыніцай па вывучэнню школьнай справы ў пачатку XX ст. Яны дазваляюць вызначыць асаблівасці арганізацыі пачатковай адукацыі як навучальнай акругі, так і асобных губерняў. У Віцебскай губерні адзначаўся адзін з лепшых паказчыкаў па ахопу школамі насельніцтва і па паспяховым завяршэнні адукацыі, сярод педагагічнага персаналу тут пераважалі жанчыны, назіраліся асаблівасці і ў моўнай прыналежнасці вучняў найбольшая колькасць вучняў, якія вызначылі сваёй роднай мовай рускую (вялікарускую), і адзін з найменшых паказчыкаў вучняў-беларусаў (менш толькі ў Ковенскай губерні), што тлумачыцца як этнаканфесійнай сітуацыяй, так і магчымымі фальсіфікацыямі.*
***Ключавыя словы:*** *перапісныя лісты, пачатковыя школы, педагагічны персанал, этнічны склад вучняў*

Аднадзённы перапіс пачатковых школ Расійскай імперый быў ініцыіраваны летам 1910 г. 22 і 25 верасня, па выніках паседжанняў міжведамственай камісіі па чале з намеснікам міністра народнай асветы Р. К. Ульянавым (1859 – 1912), былі складзены праекты апытальных лістоў:

А. агульныя звесткі аб навучальнай установе, усяго 37 пытанняў;
Б. звесткі аб настаўніках (асобны ліст на кожнага), 17 пытанняў;
В. звесткі аб вучнях (імя і прозвішча, узрост, веравызнанне, родная мова, адлегласць ад дому да школы);
Г. бюджэт навучальнай установы за 1910 г.

У перапісу ўдзельнічалі адна- і двукласныя пачатковыя агульнаадукацыйныя вучылішчы. Не праводзілася апытанне ў канфесійных іўдзейскіх і мусульманскіх школах, прыватных і прафесійных вучылішчах, прагімназіях, нядзельных і вячэрніх школах для дарослых, школах для сляпых і глуханямых. 18 студзеня 1911 г. апытальныя лісты, пасля запаўнення, былі перададзены ў Перапіснае бюро. Ужо ў пачатку мая 1911 г. бюро апублікавала папярэднія дадзеныя [1, I]. Афіцыйныя дадзеныя былі апублікаваны міністэрствам народнай асветы напрацягу 1913 – 1914 гг. у 15 выпусках, якія адпавядалі вучэбным акругам. Выпуск VIII прысвечаны дадзеным Віленскай навучальнай акругі (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Ковенская, Магілёўская і Мінская губерні).

Матэрыялы перапісу дазваляюць вызначыць структуру навучальных устаноў і скласці вобраз сярэднестатыстычнага настаўніка і вучня як па губерням Віленскай акругі, так і па паветах асобных губерняў. Па некаторых пазіцыях прысутнічае інфармацыя 1856 (Цэнтральны статыстычны камітэт), 1868 (Ваенна-статыстычны зборнік), 1880 (Перапіс сельскіх школ) і 1894 (анкеты Імператарскага Вольнага Эканамічнага таварыства) гг., што дазваляе прасачыць дынаміку колькасці навучальных устаноў і педагагічнага персанала. Аналіз гэтых дадзеных дазваляе, у прыватнасці, выявіць асаблівасці сістэмы пачатковай адукацыі на тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1911 г.

У матэрыялах прысутнічае падзел навучальных устаноў, педагагічнага персанала і навучэнцаў па прынцыпу «гарадскі – сельскі». Да першай катэгорыі па Віцебскай губерні належаць уласна Віцебск, павятовыя гарады і Сураж (Віцебскі павет). з гэтай прычыны тэрмін «сельскі» будзе ахопліваць усе астатнія населеныя пункты.

На момант перапісу ў Віленскай навучальнай акрузе на адну пачатковую школу прыходзілася 1416 жыхароў, 11,3 паселішчаў і 29,8 кв. вёрст (≈ 33,9 км$^2$). з 1894 г. колькасць навучальных устаноў павялічылася з 2535 да 8973 (+ 254 %), а вучняў – з 139913 да 512561 (+ 266 %) [2, с. 3, 6]. Рост колькасці навучальных устаноў у Віцебскай губерні адлюстраваны на Графіку 1. Тут колькасць школ павялічылася з 394 да 1524 (+287 %) (у перапісе не былі вызначаны даты адкрыцця 46 школ, яшчэ 2 былі адкрыты ў пачатку 1911 г.). 129 з іх знаходзіліся ў гарадах, 1395 – у сельскай мясцовасці. На працягу 1894 – 1907 гг. іх колькасць павялічваецца ў два разы, пры гэтым пасля рэзкага прыросту 1897 (+29), 1900 (+37) і 1902 (+51) пазіраецца запаволенне росту, што можна патлумачыць неспрыяльнымі эканамічнымі і палітычнымі ўмовамі. У 1907 па 1911 гг. прырост школ склаў столькі ж колькі за папярэднія 12 год. На адну школу прыходзілася 1214 жыхароў (менш толькі ў Магілёўскай губерні – 1085), 14,7 паселішчаў і 24,2 кв. вярсты [2, с. 6 – 7].




**Графік 1. Дынаміка колькасці пачатковых навучальных устаноў у Віцебскай губерні (1894 – 1910 гг.) [2, с. 5].**

PolotskSU



39 % школ знаходзіліся ва ўласных, ці бязвыплатных памяшканнях, пры гэтым і ў горадзе, і ў сельскай мясцовасці гэты паказчык быў аднолькавы. Аднак па колькасці арэндных памяшканняў для сельскіх школ Віцебская губерня займала першае месца па акрузе – 60,7 % (пры сярэднім паказчыку 46,2 %). Тлумачыцца гэта самай нізкай колькасцю бязвыплатных памяшканняў 4,4 % (для параўнання, у Мінскай губерні гэты пазакчык дасягаў 24 %), тады як забяспечанасць сельскіх школ уласнымі памяшканнямі па акрузе была прыкладна аднолькавая. Яшчэ адной асаблівасцю Віцебскай губерні з'яўлялася самая нізкая арэндная плата для гарадскіх школ – 412 руб. (пры сярэдняй – 478); і самая высокая для сельскіх – 98 руб. (сярэдняя – 76) [2, с. 6, 10, 12, 13].

У структуры сістэмы пачатковай адукацыі Віцебскай губерні пераважалі: 1-класныя народныя вучылішчы (840 у сельскай мясцовасці і 1 горадзе) – 55,2 %; 1-класныя царкоўна-прыхадскія школы (307 і 29) – 22 % і школы граматы ( 132 і 4) – 9 % [2, с. 12]. Размеркаванне дадзеных тыпаў навучальных устаноў па паветах Віцебскай губерні прадстаўлена ў Табліцы 1.

Табліца 1. – Размеркаванне пачатковых навучальных устаноў па паветах [2, с. 6 – 13]

| Павет | Віцебскі | | Веліжскі | | Гарадокскі | | Дзвінскі | | Дрысенскі | | Лепельскі | | Люцынскі | | Невельскі | | Полацкі | | Рэжыцкі | | Себежскі | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Школы | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с | г | с |
| 1-класныя народныя вучылішчы | - | 72 | - | 72 | - | 96 | - | 84 | - | 61 | 1 | 86 | - | 72 | - | 64 | - | 90 | - | 79 | - | 64 |
| 1-класныя царкоўна-прыхадскія школы | 11 | 45 | 3 | 31 | 1 | 27 | 3 | 11 | - | 15 | 2 | 37 | - | 18 | 2 | 42 | 4 | 40 | 2 | 8 | 1 | 31 |
| Школы граматы | 1 | 60 | 2 | 1 | - | 6 | - | - | - | 2 | - | 27 | - | 6 | 1 | 12 | - | 1 | - | 2 | - | 15 |

Паводле матэрыялаў перапісу можна скласці партрэт сярэднестатыстычнага настаўніка навучальнай акругі.

Сельскі настаўнік гэта малады чалавек ва ўзросце да 25 год (61,2 %), пры гэтым амаль кожны пяты маладзей за 20 (19,9 %). Паходзіць з сялянскага асяроддзя (76,3 %), з ніжэйшай ці хатняй адукцыяй (70,7 %) – скончыў двукласную школу, ці караткачасовыя педагагічныя курсы, альбо вучыўся дома. Атрымлівае ад 223 (Мінская губерня) да 340 руб (Магілёўская губерня), забяспечаны жыллём пры школе, ці жыве ў класным пакоі. Агульны педагагічны стаж – менш 5 гадоў (50,8 %), што тлумачыцца маладым сярэднім узростам. Сямейнае становішча – халасты (70,3 %). Знайсці пару сярод сельскіх настаўніц з аднаго боку было лёгка – 85,8 % з іх былі свабодны, а 74,1 % – былі маладзей за 25 год. Аднак настаўніцы складалі ўсяго 35,1 % ад педагагічнага сельскага персанала і былі нераўнамерна прадстаўлены па губерням. Адрозніваліся настаўніцы і сацыяльным паходжаннем, і адукацыйным узроўнем. 30 % паходзіла з духоўнага стану, 18,3 – з мяшчанскага, 17,6 – з дваран. 57,4 % сельскіх настаўніц мела сярэднюю духоўную ці свецкую адукацыю. Сярэдні гадавы заробак настаўніц быў большы, аднак на практыцы гэта залежыла ад тыпу навучальных устаноў. Так, у школах граматы настаўніцы атрымлівалі амаль у два разы больш – 69 супраць 36 руб. У народных вучылішчах і царкоўна-прыхадскіх школах больш атрымлівалі настаўнікі, але розніца ў заробках тут была не вельмі істотная – 299 і 293 руб.; і 368 і 363 руб. адпаведна [2, с. 12 – 16].

Гарадскі настаўнік меў ад 26 да 40 год і больш (81,1 %). Найбольш маладзейшых за 25 год было ў Магілёўскай губерні – 25,8 %, найменш – у Віленскай (11,5 %) і Мінскай (12, 2 %). 67,2 % былі жанатыя, 60,9 % мелі сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю. Паходзіў гарадскі настаўнік пераважна з мяшчанскага асяроддзя, зарабляў ад 534 (Віленская губ.) да 452 руб. (Мінская губ.). Пераважная большасць працавала ўжо 16 год. Колькасць жанчын сярод педагагічнага персаналу складала 46,1 %. Гарадскія настаўніцы пачатковых школ былі маладзейшыя – да ўзроставай групы +26 год належыла 48,4 %. 76,1 % не знаходзіліся ў шлюбных адносінах, 5,7 % з'яўляліся ўдовамі. Найбольшая колькасць незамужніх настаўніц назіралася ў Віленскай губ. – 82,7 %, найменшая ў Мінскай – 71,3 %. Пераважная большасць настаўніц мела сярэднюю свецкую (56,2 %) ці духоўную (21,9 %) адукацыю. 2 настаўніцы з Гродзенскай губ. мелі вышэйшую адукацыю – адзіныя сярод педагагічнага персанала пачатковых школ усёй навучальнай акругі. А вось сярэдні заробак гарадской настаўніцы быў меншым за настаўніка – 473 і 338 руб. адпаведна [2, с. 12 – 16].

Галоўнай асаблівасцю складу педагагічнага персаналу пачатковых школ Віцебскай губерні з'яўляецца перавага жанчын – 55,2 % (58,8 % у гарадах і 54,7 % у сельскай мясцовасці). У адсоткавых суадносінах найбольшая колькасць настаўніц працавала ў Веліжскім, Невельскім, Дрысенскім і Гарадокскім паветах, найменш – у Рэжыцкім і Себежскім. з тэрыторыі Віцебскай губерні, якая сёння ўваходзіць у склад Беларусі, настаўнікі-мужчыны пераважалі толькі ў Лепельскім павеце (Табліца 2).

Што датычыцца ўзроўня сярэдняга заробку, то тут назіралася сітуацыя характэрная ўсёй навучальнай акрузе. Па губерні настаўніцы атрымлівалі атрымлівалі ў сярэднім на два рублі больш за настаўнікаў. Большыя за мужчын заробкі атрымлівалі настаўніцы Гарадокскага, Дрысенскага, Лепельскага, Люцынскага, Невельскага і Себежскага паветаў. Пры гэтым у Люцынскім павеце больш за мужчын атрымлівалі не толькі сельскія, але і гарадскія настаўніцы – 363 супраць 347 і 393 супраць 388 руб. адпаведна [2, с. 46 – 53].

Асобна ад астатніх разглядаліся выкладчыкі Закона Божага. Па віцебскай губерні іх налічвалася 1591. з іх 1123 былі святарамі і 468 – свецкімі асобамі, выкладчыкамі школ. Сярод святароў 90,3 % атрымлівалі плату, якая ў сярэднім складала 41 руб. пры нагрузцы 4,1 занятка ў тыдзень. Такі узровень платы быў ніжэйшым па акрузе (сярэдні – 46 руб.), пры гэтым ён не залежыў ад нагрузкі. Для параўнання, у Віленскай губерні пры сярэняй нагрузцы 3,6 заняткаў святары атрымлівалі 53 руб. з ліку свецкіх выкладчыкаў плату атрымлівалі 66,2 % (найбольшы паказчык па акрузе). Іх заробак складаў 32 руб. (сярэдні – 28) [2, с. 12]. Сярод святароў-выкладчыкаў было 143 ксяндза, найбольшая колькасць якіх была сканцэнтравана ў Дзвінскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветах (Табліца 3).

PolotskSU



Табліца 2. – Педагагічны персанал пачатковых школ Віцебскай губерні [2, с. 46 – 52]

| Павет | Горад | | | | Сельская мясцовасць | | | | Разам | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | м | % | ж | % | м | % | ж | % | м | % | ж | % |
| Віцебскі | 37 | 45 | 45 | 55 | 76 | 37 | 130 | 63 | 113 | 39 | 175 | 61 |
| Веліжскі | 8 | 42 | 11 | 58 | 46 | 32 | 97 | 68 | 54 | 33 | 109 | 67 |
| Гарадокскі | 1 | 25 | 4 | 75 | 57 | 37,5 | 95 | 62,5 | 58 | 37 | 99 | 63 |
| Дзвінскі | 20 | 38,5 | 32 | 61,5 | 68 | 51,5 | 64 | 48,5 | 88 | 48 | 96 | 52 |
| Дрысенскі | 2 | 50 | 2 | 50 | 33 | 36 | 59 | 64 | 35 | 36,5 | 61 | 63,5 |
| Лепельскі | 5 | 45 | 6 | 55 | 96 | 54 | 82 | 46 | 101 | 53,4 | 88 | 46,6 |
| Люцынскі | 2 | 33,3 | 4 | 66,6 | 75 | 59,5 | 51 | 40,5 | 77 | 58,3 | 55 | 41,7 |
| Невельскі | 5 | 33,3 | 10 | 66,6 | 50 | 35,7 | 90 | 64,3 | 55 | 35,5 | 100 | 64,5 |
| Полацкі | 9 | 31 | 20 | 69 | 69 | 43,7 | 89 | 56,3 | 78 | 41,7 | 109 | 58,3 |
| Рэжыцкі | 7 | 54 | 6 | 46 | 60 | 59,4 | 41 | 40,6 | 67 | 58,8 | 47 | 41,2 |
| Себежскі | 4 | 57 | 3 | 43 | 72 | 58,5 | 51 | 41,5 | 76 | 58,5 | 54 | 41,5 |
| Разам | 100 | 41,2 | 143 | 58,8 | 702 | 45,3 | 849 | 54,7 | 802 | 44,8 | 992 | 55,2 |

Табліца 3. – Каталіцкія святары сярод выкладчыкаў Закона Божага ў пачатковых школах Віцебскай губерні [2, с. 46 – 53]

| Павет | Горад | Сельская мясцовасць | Разам | % ад агульнай колькасці выкладчыкаў | % ад колькасці выкладчыкаў-святароў |
|---|---|---|---|---|---|
| Віцебскі | 2 | - | 2 | 0,8 | 1,6 |
| Веліжскі | 1 | - | 1 | 0,75 | 1 |
| Дзвінскі | 9 | 52 | 61 | 40,9 | 55,4 |
| Дрысенскі | 1 | 7 | 8 | 8,7 | 9,4 |
| Лепельскі | 1 | 1 | 2 | 1,15 | 1,5 |
| Люцынскі | 2 | 35 | 37 | 27,8 | 38,1 |
| Рэжыцкі | 3 | 29 | 32 | 31,7 | 50,8 |
| Разам | 19 | 124 | 143 | 9 | 12,7 |

Значны статыстычны матэрыял перапісу датычыцца навучэнцаў пачатковых школ. У Віцебскай губерні ў 1911 г. вучыліся 51191 хлопчыкаў і 24511 дзяўчынак, што складала 4,09 % насельніцтва. Па гэтаму паказчыку губерня знаходзілася на 3 месцы па акрузе саступаючы Гродзенскай (4,67 %) і Магілёўскай (5,60 %). Найбольшы паказчык навучэнцаў адзначаўся ў Віцебскім (5,24 %) і Невельскім (4,87 %) паветах, найменшы – у Дзвінскім (2,92 %) і Рэжыцкім (3,49 %). Пры гэтым, трэба адзначыць, што па адсоткавай колькасці дзяўчынак сярод навучэнцаў Віцебская губерня (32, 4 %) саступала толькі Ковенскай (32,6 %) [2, с. 6 – 7].

Існаваўшая сетка школ губерні не дазваляла ў поўнай меры забяспечыць патрэбу ў адукацыі – у 1910 г. было адмоўлена ў паступленні 9612 дзецям, што адпавядала 24,7 % навучэнцаў малодшага аддзялення, пры гэтым ў 46,8 % выпадкаў прычынай з'яўлялася цесната памяшканняў. Аднак ў параўнанні з іншымі губернямі сітуацыя тут была адной з лепшых – другое месца па акрузе (саступала толькі Віленскай – 23,5 %, пры сярэднім 29,5 %) [2, с. 8, 12].

У навучальны працэс былі ўцягнуты 19,1 % дзяцей ва ўзросце ад 7 да 14 год (больш толькі ў Гродзенскай (22, 7 %) і Магілёўскай (23,5 %) губерні) [2, с. 18]. Таксама Віцебская губерня займала першае месца па акрузе па колькасці вучняў, якія скончылі поўны курс – 7,6 % ад агульнай колькасці навучэнцаў у 1910 г. (сярэдні – 6,6 %) [2, с. 8].

Цікавая стуацыя ў Віцебскай губерні датычылася сістэмы хедэраў – яўрэйскіх рэлігійных пачатковых школ. У цэлым па навучальнай акрузе з 1894 г. назіраўся працэс змяншэння іх колькасці і колькасці вучняў, і адначасова – рост колькасці яўрэйскіх вучняў у свецкіх навучальных установах. У Віцебскай губерні колькасць хедэраў знізілася за адпаведны перыяд з 499 да 400 (- 20 %), аднак пры гэтым адбыўся рост колькасці навучэнцаў з 4017 да 13529 (+237 %). У адсоткавых суадносінах гэта выглядае наступным чынам: у 1894 г. на Віцебскую губерню 11,6 % хедэраў і 8,5 % іх навучэнцаў, а ў 1911 г. – 20,6 % і 37 % адпаведна. Сярэдняя колькасць навучэнцаў на адну школу ўзрасла з 8 да 34, у той час як па астатнім губерням гэты паказчык не перавышаў 15 [2, с. 21].

Асобна трэба адзначыць этнічную прыналежнасць вучняў, якая вызначалася па роднай мове. У Віцебскай губерні адзначаўся самы высокі паказчык вучняў, якія вызначылі роднай мовай рускую – 47,04 % хлопчыкаў і 48,83 % дзяўчынак; а таксама нізкі ўзровень беларусаў – 29,89 і 23,54 % адпаведна [2, с. 20]. Падрабязная інфармацыя па гэтаму пытанню па паветах прыводзіцца па школах Міністэрства народнай асветы і ведамства Праваслаўнага веравызнання (1375 школ, ці 90 % з тых, што падпалі пад перапіс) (Табліца 4).

Табліца 4. – Вучні пачатковых школ Міністэрства народнай асветы і ведамства Праваслаўнага веравызнання, якія вызначылі сваёй роднай мовай беларускую [2, с. 83 – 85, 95 – 97]

| Павет | Горад | | | | Сельская мясцовасць | | | | Разам | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | х | % | д | % | х | % | д | % | х | % | д | % |
| Віцебскі | 300 | 14,8 | 38 | 2,5 | 811 | 19,9 | 279 | 13,75 | 1111 | 18,2 | 317 | 9 |
| Веліжскі | 148 | 38,2 | 31 | 11,9 | 1037 | 27,4 | 325 | 23,3 | 1185 | 28,4 | 356 | 21,5 |
| Гарадокскі | 45 | 58,4 | 8 | 5,3 | 2104 | 55 | 1003 | 66,5 | 2149 | 55 | 1011 | 61 |
| Дзвінскі | 168 | 15,8 | 47 | 5,8 | 1039 | 27,2 | 467 | 26,2 | 1207 | 24,75 | 514 | 19,8 |
| Дрысенскі | 70 | 71 | 24 | 35,8 | 1328 | 54 | 597 | 52,6 | 1398 | 54,6 | 621 | 51,7 |
| Лепельскі | 142 | 62,3 | 93 | 52,8 | 2519 | 54,6 | 726 | 27 | 2661 | 55 | 819 | 28,6 |
| Люцынскі | - | - | 51 | 35,9 | 421 | 12,1 | 203 | 13 | 421 | 11,7 | 254 | 14,9 |
| Невельскі | 54 | 15,3 | 32 | 8,3 | 664 | 18,6 | 356 | 20,4 | 718 | 18,3 | 388 | 18,2 |
| Полацкі | 110 | 20,1 | 132 | 34,8 | 2541 | 60,6 | 943 | 61,75 | 2651 | 55,9 | 1075 | 56,4 |
| Рэжыцкі | 26 | 8,6 | - | - | 19 | 0,6 | 7 | 0,48 | 45 | 1,9 | 7 | 0,4 |
| Себежскі | 103 | 55,7 | 13 | 7,2 | 515 | 17,5 | 209 | 15,7 | 618 | 19,75 | 222 | 14,7 |
| Разам | 1166 | 21,6 | 469 | 10,8 | 12998 | 32,6 | 5115 | 29,7 | 14164 | 31,3 | 5584 | 25,9 |

PolotskSU



Такая сітуацыя тлумачыцца з аднаго боку этнаканфесіянальным складам насельніцтва губерні: наяўнасцю значнай колькасці латышскага насельніцтва ў Дзвінскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветах, а таксама старaабрадцаў. Першыя складалі 14,91 % вучняў-хлопчыкаў і 13,71 % дзяўчынак; другія 5,45 % і 5,04 % [2, с. 19]. Гэта правамерна зніжала долю тых, хто вызначаў беларускую ў якасці роднай мовы. У Гарадокскім, Дрысенскім, Лепельскім і Полацкім паветах доля беларусаў адпавядала сярэднестатыстычнаму паказчыку па навучальнай акрузе. Нізкая колькасць вучняў-беларусаў у Віцебскім павеце (тут паказчык ніжэй за Дзвінскі і Веліжскі павет) вынікае з таго, што ў 60 школах ведамства Праваслаўнага веравызнання беларусаў сярод 3141 вучня, па дадзеных перапісу, не значылася. Найбольш верагодна, што на нейкім этапе яны былі залічаны да вялікарусаў, бо ў астатніх паветах губерні такой сітуацыі не назіралася [2, с. 95].

Такім чынам, матэрыялы аднадзённага перапісу пачатковых школ 18 студзеня 1911 г. з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па вывучэнню школьнай справы ў пачатку ХХ ст., аднак у асобных выпадках да іх трэба ставіцца крытычна. Што ж датычыцца асаблівасцей сістэмы пачатковай адукацыі на тэрыторыі Віцебскай губерні, то тут можна вылучыць наступныя: у параўнанні з іншымі губернямі Віленскай навучальнай акругі тут назіраўся адзін з лепшых ахопаў насельніцтва пачатковымі школамі, пры гэтым большая іх частка знаходзілася ў арэндных будынках, з арэнднай платай большай за сярэднюю; у Віцебскай губерні захоўвалася сістэма яўрэйскай рэлігійнай адукацыі, тады як у астатніх губернях колькасць хедэраў і іх вучняў зніжалася; у педагагічным персанале пачатковых школ губерні пераважалі жанчыны, такая сітуацыя была характэрна для 7 з 11 паветаў; у губерні адзначалася найбольшая колькасць вучняў, якія вызначылі сваёй роднай мовай рускую (вялікарускую), і адзін з найменшых паказчыкаў вучняў-беларусаў (менш толькі ў Ковенскай губерні), што тлумачыцца як этнаканфесійнай сітуацыяй, так і магчымымі фальсіфікацыямі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**
1. Однодневная перепись начальных школ империи, произведённая 18 января 1911 г. Выпуск I. С. –Петербургский учебный округ. – ред. В.И. Покровский. – Санкт-Петербург: Типография «Экономия», 1913. – II, 28, 112 с.
2. Однодневная перепись начальных школ империи, произведённая 18 января 1911 г. Выпуск VIII. Виленский учебный округ. – ред. В.И. Покровский. – Санкт-Петербург: Типография тов-ва «Екатерингофское печатное дело», 1914. – 26, 134 с.

**THE SYSTEM OF PRIMARY EDUCATION IN THE VITEBSK PROVINCE ACCORDING TO THE RESULTS OF THE CENSUS OF JANUARY 18, 1911.**

S. MENCHENYA

*The materials of the one-day census of primary schools on January 18, 1911 are a valuable source for studying school system at the early twentieth century. They allow to define features of the organization of primary education both educational district, and separate provinces. In the Vitebsk province one of the best indicators on coverage of schools of the population and on successful completion of education was noted, among pedagogical personnel here women prevailed. There were features in a language affiliation of pupils: the greatest quantity of pupils who have defined Russian (Great Russian) language as a native, and one of the smallest indicators of Belarusian students (less only in Kaunas province), what is explained by both the ethno-confessional situation and possible falsifications.*
***Key words:*** *questionnaires, primary schools, teaching staff, the ethnic composition of pupils*

УДК 316.7. 394.398

## ОСОБЕННОСТИ КОММУНИКАТИВНОЙ КУЛЬТУРЫ В УСЛОВИЯХ ФОРМИРОВАНИЯ СОВЕТСКОГО НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА НОВОГО ТИПА (НА ПРИМЕРЕ КОЩАКОВСКОГО СЕЛЬСОВЕТА ТАТАРСКОЙ АССР В ПЕРИОД С 1940-х ПО 1960-е гг.)

**Саитова К.М.**
Российская Федерация, Республика Татарстан, Казань

*В статье анализируются особенности традиционной коммуникативной культуры жителей на территории Кощаковского сельсовета Татарской АССР в период трансформации колхозов в совхозные (государственные) образования. Приводятся воспоминания старожилов о жизненном укладе до и после вступления в совхозы. Фиксируется отношение информантов к процессу трансформации, их творческая переработка и проживание новой реальности. Делается вывод, что при трансформации общественного уклада традиционная культура поселения продолжала осуществлять свои коммуникационные функции с помощью ритуалов и текстов наиболее отвечающим меняющейся действительности. В статье использован эмпирический материал, полученный с помощью стационарного метода этнографических наблюдений. Автор был интегрирован в общину в качестве преподавателя и помощника-реконструктора традиционных календарных праздников в течение четырех лет.*
***Ключевые слова:*** *совхозная культура; традиционная культура; трансформация; община*

Объект исследования – трансформация традиционных праздников, ритуалов, текстов. Предмет – использование новой коммуникативной культуры жителями общины в период становления совхозных хозяйств в Кощаковском сельсовете Татарской АССР (40-60-е годы 20 века).

Целью данной статьи является обзор материалов, которые преподаватели детской школы искусств собирали в течение четырех лет на территории Кощаковского сельского поселения, бывшей Кощаковской волости Казанского уезда Казанской губернии и бывшей Татарской АССР. В селе был организован филиал отделения фольклорного искусства и сформирован план исследовательской работы для наполнения учебных программ, создания методических пособий. Таким образом, нам удалось интегрироваться в общину бывшего совхозного хозяйства зверосовхоза «Кощаковский», в том числе и выполняя роль популяризаторов, в качестве помощников-конструкторов календарных праздников Свято-Троицкого прихода села.

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 1/8. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.